Нязвыклая ў вачах Бога

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
05.12.2021 00:00



Урачыстасць Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі святкуем 8 снежня. В а ўрачыстасць Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі Касцёл запрашае ўсіх людзей углядацца ў прыклад звычайнай дзяўчыны, якая была, аднак, нязвыклай у вачах Бога.

У
нікальнасць Марыі заключалася не толькі ў Божай абранасці, але і ў тым, што Яна змагла адказаць на гэты дар паслухмянасцю і бездакорным выкананнем Божай волі. Што яшчэ адрознівала Марыю ад іншых, дык гэта Яе чыстае сэрца і бязмежны давер да Бога. Яна была вялікай, таму што была поўная Бога. Прыклад Беззаганнай кажа нам, што мы вялікія не з-за свайго прозвішча, якое, магчыма, дасталася нам у спадчыну, не з-за сваёй працы, пасады, ведаў. Мы важныя настолькі, наколькі наша сэрца “поўнае ласкі”. Гэта значыць, ці дастаткова яно поўнае Бога і адчувальнае, каб мець магчымасць адказаць “так” на прапанову Пана.
†

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
05.12.2021 00:00

У момант Звеставанння Марыя адным сваім словам дазволіла Богу здзейсніць нешта вялікае. І дзякуючы гэтаму Яна заслужыла тытул Беззаганнай. Згода Марыі стаць Маці Хрыста і немарнаванне атрыманай ад Бога ласкі вучыць нас, як у сваім жыцці адказваць Усемагутнаму. Гледзячы на сваё жыццё, мы разумеем, што яно няпростае. Бог хоча, каб мы далі Яму шанс здзейсніць вялікія рэчы ў нашым пакліканні. Для кожнага чалавека Бог падрыхтаваў план. Ён даў нам таленты і здольнасці, каб мы як мага лепш выконвалі сваё пакліканне. Нам са свайго боку застаецца дазволіць Богу ажыццявіць гэты план. Прыклад Беззаганнай дапамагае і заахвочвае не марнаваць тое, што кожны дзень атрымліваем ад Усемагутнага. І адным з дароў, якія былі нам удзелены, напрыклад, у сакраманце святога хросту, з'яўляецца пакліканне да святасці.

Марыя Беззаганная вучыць сваіх дзяцей, што святасць – гэта задача не толькі на некалькі гадоў, але на ўсё жыццё, і яна здабываецца праз вернасць свайму пакліканню ў штодзённым выкананні дадзенага слова, нават калі гэта каштуе нам шмат намаганняў і ахвяр. Марыя рэалізавала сваю святасць у простай штодзённасці, кожны дзень пацвярджаючы ўласнае "так" у сваім жыцці. Калі Яна як выбраная сказала "так", ніколі не здраджвала свайму слову, а выконвала яго кожны дзень, служачы Богу.

Папа Пій IX, абвяшчаючы дагмат аб Беззаганным Зачацці Марыі, прызнаў, што Яна н

Кожны з нас быў пакліканы Богам, каб наша жыццё стала штодзённым адказам на тое, што Бог хоча зрабіць для нас. Са свайго боку нам застаецца паверыць, што Бог не карыстаецца чалавечымі "кастынгамі", каб выбраць для спецыяльных заданняў. Ён ведае, як найлепш асвяціць сціплае жыццё простага чалавека. І ўказальнікам на гэтым шляху з'яўляецца выкананне Божай волі.

Нязвыклая ў вачах Бога

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
05.12.2021 00:00

